**Уладзімір Карэлін, Мікалай Мельнікаў**

# Рэдкія сюжэты ў іканапісу Беларусі (частка 2)

**Vladimir Karelin, Nikolaj Melnikov**

**Rare plots in the icon-painting of Belarus (part II)**

The article presents some rare iconographic subjects, which appear no more than three times in Belorussian churches. Brief descriptions of the depicted saints and the iconography of certain works are considered.

*Kewords:* icon, the Holy martyrs, iconography, attributes

**Володимир Карелін, Микола Мельников**

**Рідкісні сюжети в іконопису Білорусі (ч. 2)**

У статті розглянуто іконографічні сюжети, які досить рідко трапляються у храмах Білорусі – не більше ніж у трьох випадках. Наведено короткі відомості про зображених святих, розглянуто іконографію окремих творів.

*Ключові слова:* образ, святі мученики, іконографія, атрибути

У дадзеным паведамленні, як ужо адмячалася раней[1], разглядаюцца асаблівасці іканаграфіі асобных, рэдка сустракаемых на Беларусі абразоў, прыводзяцца іх тэхнічныя дадзеныя і падаюцца кароткія звесткі аб персанажах, згодна літаратурных крыніц[2]. Дні шанавання святых прыводзяцца па грыгарыянскаму і юліянскаму календарах.

Святая пакутніца Глікерыя Іраклійская, якая паходзіла са знатнага роду, пацярпела за Хрыстову веру ў 2 ст. пры імператары Антаніне, прыняўшы пакутніцкую смерць у Гераклеі Фракійскай. Яе памяць шануецца ў Праваслаўнай царкве 26 (13) траўня. Адзіны абраз з выявай святой (канец 19 – пачатак 20 ст., палатно, алей, 60x40) зафіксаваны ў Гарэцкім раёне Магілёўскай вобл. св. Глікерыя прадстаўлена ў поўны рост, у выглядзе маладой дзяўчыны з непакрытай галавой і доўгімі валасамі, якія раскінуліся па плячах. Яна апранута ў доўгую сукенку і плашч, што хвалямі ляжыць на сагнутых у лакцях руках, скіраваных у правы бок. У левай руцэ знаходзіцца крыж.

Хрысціянскі святы Дарафей Газскі (ава Палесцінскі) нарадзіўся ў заможнай сям'і ў пачатку 6 ст. Ён атрымаў добрую адукацыю і праз нейкі час прыняў манаскі пострыг. У далейшым заснаваў свой манастыр, ігуменам якога заставаўся да самай смерці. св. Дарафей, знакаміты сваімі павучэннямі і пасланнямі, шануецца як прападобны; памяць адзначаецца ў праваслаўнай царкве 18 (5) чэрвеня, у каталіцкай царкве – 5 чэрвеня. У храме г. Талочын Віцебскай вобл. выяўлены абраз з паясной выявай прападобнага Дарафея (іл. 1). Святы прадстаўлены ў выглядзе старца з доўгімі сівымі валасамі і барадой. Двума рукамі ён трымае каля грудзей закрыты малітоўнік.



*Іл. 1. Св. Дарафей Газскі. Пачатак XX ст; г. Талочын Віцебскай вобл. Палатно, алей, 0,95х0,66.*

У царкве г. Кобрына Брэсцкай вобл. знаходзіцца разныківот (іл. 2;) з паяснай выявай св. прападобнага Яўгенія. У ніжняй частцы ківота змешчана таблічка з надпісам: «Отцу Протоіерею Евгению Селецкому отъ благодарныхъ прихожанъ Лещинского прихода г. Пинска 1936 г.». Паколькі на абразе святы прыведзены ў сталым узросце, аб чым сведчаць сівыя валасы і барада, слушна выказаць думку, што гэта прападобны Яўгеній Эталійскі. Ён нарадзіўся ў 1595 г. у эталійскай вёсцы і ў юнацкім узросце сыйшоў у манастыр. Падчас паломніцтва ў Святую Зямлю завітаў у Александрыю, дзе прыняў сан святара ад патрыярха Кірылы Лукарыса. Шмат гадоў спалучаў пастырскую і асветніцкую дзейнасць у Канстанцінопалі і іншых месцах, з'яўляўся абаронцам праваслаўя. На завяршэнні жыццёвага шляху выдаліўся ў манастыр, дзе памёр у 1682 г. У 1982 г. Усяленскі Патрыярхат далучыў Яўгенія Эталійскага да ліку святых і ўстанавіў дзень яго памяці 18 (5) жніўня.



*Іл. 2. Св. прападобны Яўгеній. 1936 г.; г. Кобрын Брэсцкай вобл. Дошка, алей*

Прападобнапакутніца Еўдакія Іліопальская, самаранка па паходжанні, згодна падання жыла ў 2 ст. у фінікійскім Геліопалі. Яна была вельмі прыгожая, займалася блудам і прыдбала вялікае багацце. Аднак праз нейкі час пад уплывам манаха Германа прыняла хрысціянства, аддала ўсё сваё багацце на патрэбу бедным і стала манахіняй у жаночым манастыры. Там яна праславілася дабрачыннасцю і аскетызмам, і пасля смерці ігуменні была абрана на яе месца. Падчас намесніка Дыягена Еўдакія перанесла жорсткія пакуты, а потым, па загаду яго пераемніка, загінула ад мяча недзе каля 160–170 гг. У праваслаўнай царкве памяць адзначаецца 14 (1) сакавіка, у каталіцкай – 1 сакавіка. З чатырох зафіксаваных абразоў з выявай св. Еўдакіі фотаздымак маецца толькі ад-



*Іл. 3. Св. прападобнапакутніца Еўдакія Іліопальская. Другая палова XIX ст.; Гродзенскі раён. Палатно, алей, 0,76 х 0,65*

нага – з Гродзенскага раёна (іл. 3), дзе прадстаўлена яўленне Маці Божай прападобнапакутніцы Еўдакіі. Апошняя паказана ўкленчанай падчас яе малення перад абразком. Над галавой Еўдакіі змешчаны надпіс – «Се преп.муч. Евдокія», а вышэй, у правым вугле абраза, яшчэ адзін – «Матерь Господа Бога Вышняго Заступница всехъ скорбящихъ христиан».

У двух храмах Глыбоцкага раёна Віцебскай вобл. знаходзяцца абразы св. прападобных Еўпраксіі і Алімпіяды. Згодна жыційных звестак, абедзве нарадзіліся ў шляхетных заможных сем'ях. Пасля смерці бацькоў яны раздалі сваё багацце беднякам і сіратам, а самі пайшлі ў манастыр (Алімпіяда з часам была прызначана дыяканісай), дзе праславіліся сціпласцю, аскетызмам, беззаганнасцю і цудамі. Еўпраксія памерла ў 413 г. ў 30-гадовым узросце, а Алімпіяда – у 409 г. Дзень іх памяці ў праваслаўнай царкве – 7 жніўня (25 ліпеня). На абодвух абразах (пачатак 20 ст., дошка, алей, 60 х 40) прадстаўлены роставыя выявы святых Еўпраксіі і Алімпіяды ў выглядзе маладых жанчын у манашаскім аблачэнні з крыжамі ў руках (на адным абразе Алімпіяда трымае кадзільніцу).

Вялікапакутнік Еўстафій Плакіда, апякун паляўнічых, быў вайсковым начальнікам падчас праўлення імператараў Ціта і Траяна. Аднойчы на паляванні ён убачыў між рагоў аленя крыж з распятым Хрыстом, пасля чаго прыняў хрысціянства разам з жонкай і дзецьмі. Ён перанёс многа нязгод і выпрабаванняў, і пры імператары Андрыяне за адказ прынесці ахвяру ў паганскім храме быў кінуты разам з сям’ёй у сярэдзіну распаленага меднага быка, дзе ўсе загінулі. Памяць вялікапакутніка адмячаецца ў праваслаўнай царкве 3 кастрычніка (20 верасня), у каталіцкай – 20 верасня. На абразе з Мастоўскага раёна Гродзенскай вобл. (іл. 4) св. Еўстафій прадстаўлены ў поўны рост, у даспехах рымскага воіна, на фоне пейзажу. Двума рукамі ён трымае вялікі драўляны крыж. На другім абразе (канец 19 ст., дошка, алей, 105 х 66) з гэтага ж раёна (таксама з роставай выявай святога ў даспехах), Еўстафій у левай руцэ трымае кап’ё, а над яго галавой, на воблаках, змешчана паясная выява благаслаўляючага Хрыста. Яшчэ на адным творы з Карэліцкага раёна Мінскай вобл. (канец 19 ст., дошка, алей, 31х25) з паяснай выявай вялікапакутніка, апошні ў левай руцэ трымае пальмавую галіну.



*Іл. 4. Св. вялікапакутнік Еўстафій Плакіда. Канец XIX ст. Мастоўскі раён Гродзенскай вобл. Палатно, алей, 0,75х0,37*

Святая пакутніцадзева Еўфрасія пацярпела за веру ў Нікадзіміі падчас Максіміянавых ганенняў на хрысціян. За адказ прынесці ахвяру ідалам, яе аддалі на здзекі аднаму з воінаў. Штоб захаваць цнатлівасць, Еўфрасія прынесла яму «абярэг-траву» і прапанавала апрабаваць на сабе. Яна палажыла траву на шыю, і воін, узмахнуўшы мячом,

адсёк ёй галаву. Адбылося гэта ў 303 г. Памяць святой адзначаецца 1 лютага (19 студзеня). На адзіным абразе з г. Хоцімска Магілёўскай вобл. (іл. 5) Еўфрасія прадстаўлена ў выглядзе маладой прыгожай дзяўчыны, якая басаної стаіць на беразе рэчкі. Правую руку яна прыціскае да грудзей, у левай трымае крыж і пальмавую галінку.



*Іл. 5. Св. пакутніца-дзева Еўфрасія. Пачатак XX ст.; г. Хоцімск Магілёўскай вобл. Палатно, алей, 0,53х0,42*

Адной з найбольш загадкавых асобаў Беларускага Пацерыка з'яўляецца прападобны Елісей Лаўрышаўскі, праваслаўны святы 13 ст. Згодна з жыціем, якое захавалася толькі ў перакaзе гісторыка 17 ст. Альберта *Каяловіча, Елісей* быў сынам князя Траняты *і займаў* высокае становішча пры двары вялікага князя літоўскага Міндоўга. Пасля прыняцця хрысціянства ён пакінуў прыдворную службу і пасяліўся ў пустыні, дзе яго знайшоў нейкі праваслаўны манах. Разам яны заснавалі на беразе Нёмана Лаўрышаўскі манастыр, які ў 13 ст. стаў духоўным і культурным цэнтрам Вялікага княства Літоўскага. Каля 1329 г. для Лаўрышаўскага манастыра было напісана

на пергаменце рукапіснае Евангелле – помнік беларускага кнігапісання, якое цяпер знаходзіцца ў Кракаве. Елісей быў забіты юнаком-служкай ў ноч на 23 кастрычніка каля 1250 г. Мошчы прападобнага, якія знаходзіліся ў манастыры, праславіліся як цудадзейныя. Згодна падання, іменна яго мошчы дапамаглі ў 1505 г. абараніць манастыр ад нашэсця крымскіх татар. Елісей Лаўрышаўскі быў кананізаваны Кіеўскім мітрапалітам Іосіфам ІІ Солтанам на *Віленскім саборы 1514 г.*, з 1984 г. ён уваходзіць у Сабор Беларускіх святых. У 1996 г. св. Елісею ў Лаўрышаве ўстаноўлены помнік. Дзень яго памяці – 5 лістапада (23 кастрычніка). У 2000 г. паблізу вёскі Гнесічы, на месцы былога манастыра, адбылося асвячэнне новага храма ў імя святога Елісея Лаўрышаўскага. У гэтым храме знаходзіцца сучасны абраз з выявай святога, дзе прападобны Елісей прадстаўлены ў поўны рост, у выглядзе сівабародага старца ў манашаскім аблачэнні. Правай рукой ён благаслаўляе, у левай трымае чоткі. На абразе, выкананым у інсітным стылі, з храма ў в. Лаўрышава (іл. 6), Елісей паказаны яшчэ падчас мірскога жыцця – ён сядзіць у княжацкай вопратцы, са шчытом і дзідай у руках.

Даволі рэдкі сюжэт «Зачацце Іаана Прадцечы» быў выяўлены ў капліцы са Столінскага раёна Брэсцкай вобл. На абразе (іл. 7) прадстаўлена падзея, што адбылася з першасвятаром Захарыяй ва Іерусалімскім храме і



*Іл. 6. Св. прападобны Елісей Лаўрышаўскі. ХХ ст.; г. Хоцімск Гродзенскай вобл. Палатно, алей, 0,96 х 0,64*



*Іл. 7. Зачацце Іаана Прадцечы. Канец XVIII ст. Столінскі раён Брэсцкай вобл. Дошка, алей, 0,52х0,47*

пра якую паведамляецца ў Евангеллі ад Лукі (Лк. 1:8–13). Калі Захарыя прайшоў за алтарную завесу ў храме для каджэння фіміямам, то каля кадзільнага ахвярніка ён убачыў Арханёла Габрыэля, які паведаміў радасную вестку, што пачута яго малітва і што яго жонка Елісавета народзіць сына Іаана. Гэта падзея святкуецца 6 кастрычніка (23 верасня).



*Іл. 8. Св. Інакенцій Іркуцкі. XIX ст. г. Пінск Брэсцкай вобл. Дошка, алей, 0,57х0,39*

У саборы г. Пінска захоўваецца адзіны занатаваны вобраз святога Інакенція Іркуцкага (у міру Іван Кульчыцкі), ураджэнца Чарнігаўскай губерні, епіскапа, які з 1727 г. і да самай смерці ў 1731 г. упраўляў Іркуцкай епархіяй. У 1804 г. ён праслаўлены Расійскай Царквой у ліку святых. Памяць шануецца 9 снежня (26 лістапада) і ў трэці тыдзень па Пяцідзесятніцы. На абразе (іл. 8) св. Інакенцій у мітры і архіерэйскім аблачэнні стаіць на круглым амбоне з паднятымі ўгару рукамі. Усё поле абраза, акрамя ліка святога, закрыта металічным чаканным абкладам.

У храмах Беларусі зафіксаваны дзве выявы Іаана Кранштацкага (у міру Іван Ільіч Сергіеў), ураджэнца Архангельскай губерні (1829–1909), мітрафорнага протаіерэя, настаяцеля Андрэеўскага сабора ў Кранштаце, прапаведніка і духоўнага пісьменніка. У 1964 г. далучаны да ліку святых Саборам епіскапаў РПЦЗ, а ў 1990 г. – Рускай Праваслаўнай Царквой. Дні памяці – 2 студзеня (20 снежня) і 14 (01) чэрвеня. З двух абразоў больш значымым з’яўляецца хромалітаграфія на метале (іл. 9), што захоўваецца ў Маларыцкім раёне Брэсцкай вобл. Гэта паясны партрэт Іаана Кранштацкага з яго ўзнагародамі і подпісам у ніжняй частцы: «Одобряю. Протоиерей Иоанн Сергиев. 4 августа 99 г.».

Прападобны Іаан Шматпакутны жыў у 12 ст. У маладыя гады ён стаў манахам Кіева-Пячэрскага манастыра, аднак, нягледзячы на аскетычнае жыццё, знемагаў ад цялеснай запалы. Тады Іаан пасяліўся ў Атоніевай пячоры і пражыў там 30 гадоў, аднак толькі пасля таго, як зарыў сябе па плечы ў гэтай жа пячоры і правёў так 40 дзён, ён вызваліўся ад цялесных пакутаў. Памёр Іаан Шматпакутны 18 ліпеня 1160 г. Яго мошчы знаходзяцца ў Антоніевай пячоры, памяць шануецца 31 (18) ліпеня і 11 кастрычніка (28 верасня). Адзіны абраз з выявай святога (іл. 10) зафіксаваны ў Глыбоцкім раёне Віцебскай вобл. Прападобны Іаан прадстаўлены ў пячоры аголеным і зарытым па пояс у зямлю, са скрыжаванымі на грудзях рукамі. Схіліўшы галаву набок, ён пры святле лампадкі чытае кнігу, што абапіраецца на чэрап. Абраз з падобнай іканаграфіяй знаходзіцца над машчамі святога ў Бліжніх пячорах Кіева-Пячэрскай лаўры.

У храмах Гродзенскай вобл. знаходзяцца два абразы прападобнага Іаана Рыльскага. Гэты святы найбольш шануецца ў Балгарыі і лічыцца заснаваль-


*Іл. 9. Св. Іаан Кранштацкі. Канец XIX ст.; Маларыцкі раён Брэсцкай вобл., 0,324 х 0,235*

нікам знакамітага Рыльскага манастыра. Нарадзіўся ён каля 876 г. у в. Скрына, што на правым беразе р. Струмы. Пасля смерці бацькоў Іаан раздаў усю маёмасць бедным і сыйшоў у манастыр, які потым пакінуў і стаў пустэльнікам. Жыў у адзіноце спачатку ў пячоры, а потым на скале вышынёй больш 80 метраў. Згодна літаратурных крыніц, памёр у 916 г. Памяць шануецца 1 лістапада (19 кастрычніка). На абодвух абразах прадстаўлена паясная выява святога ў выглядзе старца з доўгай барадой і ў манашаскім аблачэнні. У адным выпадку ён у правай руцэ трымае скрутак, а ў другім – правай рукой абапіраецца на посах, а ў левай трымае разгорнуты скрутак з тэкстам: «Господи, возлюбих благолепие дому Твоего» (Пс. 25:8).

Амаль усе прадстаўленыя выявы святых пакутнікаў адпавядаюць іканаграфічнаму канону – гэта франтальныя роставыя ці паясныя адлюстраванні. У руках яны трымаюць сімвалы пакутніцтва – крыжы ці пальмавыя сцяблiны, а таксама скруткі з надпісамі і кнігі. У некаторых у руках знаходзяцца абразкі Маці Божай ці Спаса. Кампазіцыя абраза можа быць дапоўнена выявай бласлаўляючага Хрыста на воблаках ці архітэктурнымі элементамі. Часам сустракаецца даволі рэдкая іканаграфія такіх пашыраных сюжэтаў, як «Зачацце Іаана Прадцечы», ці неардынарная тэхніка выканання, як хромалітаграфія.



*Іл. 10. Св. прападобны Іаан Шматпакутны. Канец XIX ст. Глыбоцкі раён Віцебскай вобл. Палатно, алей, 0,67х0,57*

[1] Карэлін У. Р., Мельнікаў М. П. Рэдкія сюжэты ў іканапісу Беларусі // Історія релігій в Україні: Науковий щорічник. – Книга 2. – Львів, 2015. – С. 335-350.

[2] Православная энциклопедия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http;// www.pravenc.ru.